ЮБІЛЕЙ




# Льецца ў крыніцах праз гады чысціня жыватворнай вады

**І сапраўды, і душэўную лірычнасць палескага краю, і яркае суквецце галасоў беларускай зямлі, і яскравасць вясёлкі – ўсё гэта можна адчуць у песнях, якія ўжо 35 гадоў дорыць народны аўтэнтычны фальклорны калектыў з мілагучнай назвай «Крыніцы».**

Яго стваральнікам і нязменным кіраўніком на працягу шмат гадоў з'яўляўся Ігар Няхайба. Ён аб'яднаў вакол сябе ў

га народнага фальклора Ксенія Паўлаўна Даніловіч, Марыя Андрэеўна Платошына, Надзея Якаўлеўна Лемяшэўская, Алена

Менавіта ў Пінкавіцкім Доме культуры ў цёплай і святочнай атмасферы адбыўся юбілейны вечар, прысвечаны 35-годдзю народнага аўтэнтычнага фальклорнага калектыву «Крыніцы». Юбілей – гэта лепшая прычына, каб усіх сабраць разам, сустрэць сяброў, успомніць пра поспехі калектыву. Сёння ўзнагародны фонд «Крыніц» складае 32 граматы і 23 дыплома за перамогі і ўдзел у фестывалях раённага, аблас-

песень. «Крыніцы» вядуць актыўную канцэртную дзейнасць і дораць добры настрой не толькі жыхарам Піншчыны, але і прыхільнікам іх творчасці далёка за межамі Пінскага раёна. Дзякуючы намаганням удзельнікаў фальклорнага калектыву «Крыніцы» ў 2019 годзе традыцыі веснавога мясцовага карагода на Праваднуюнядзелю «Провады зімы» нададзены статут гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

З цеплынёй на юбілейным свяце ўспаміналі ўсіх, хто стаяў ля вытокаў стварэння самабытнага калектыву. Шчырыя словы падзякі за вернасць калектыву, за талент, які закранае стрункі душ чалавечых, гучалі ў адрас цяперашніх удзельніц «Крыніц» Веры Гарохавай, Валянціны Калінкінай, Ніны Гут, Сафіі Жывушка, Ніны Серабровай, Валянціны Шыцько.

Для кожнай удзельніцы «Крыніцы» – гэта творчая сям'я. Вось ужо шмат гадоў, у спякоту і мароз, у дождж і снег, адклаўшы хатнія справы, спяшаюцца ўдзельнікі калектыву на рэпетыцыі і канцэрты. Заўсёды на ўздыме і з іскрынкамі радасці ў вачах. «А лепшыя падарункі для нас, – прызналася ўдзельніца калектыву Вера Гарохава, – радасныя ўсмешкі, шчырая падтрымка і гарачыя апладысменты гледачоў. Дзеля гэтага хочацца для вас спяваць зноў і зноў».

Любы пеўчы калектыў не зможа тварыць без падтрымкі музыкантаў. Сваім майстэрствам упрыгожваюць выкананне народнай песні акампаніята-

Жанна ВЕРЫЧ

## Юбілейная віншаванка «Крыніцам»

*Як пачыналіся «Крыніцы»?*
*Адкуль іх дружны карагод?*
*І як такія маладзіцы*
*Спяваюць 35-ты год?*
*Ды проста ім пашанцавала*
*На дзіўнага кіраўніка.*
*Ён з пані Монікай удала*
*Прывёў іх ў гэты вось ДК.*
*Няхайба з гэтымі жанкамі*
*Фальклор запісваў і збіраў.*
*І гурт сваімі галасамі*
*Замежжа нават пакараў.*
*Яны так «Зыму праважалі»,*
*Што ў спіс каштоўнасцей папалі.*
*500 тых песень назбіралі,*
*Дзе з імі толькі не былі!*
*Іх на вяселлі запрашалі,*
*Карпаратывы з імі шлі.*
*Скажу вам быль, не небыліцу,*
*Які каштоўны калектыў!*
*Да алігарха у сталіцу*
*Яны свой везлі пазітыў.*
*І мы на важныя падзеі*
*Іх запрашаем у музеі.*
*Іх галасы, нават адзенне –*
*Сапраўднае ўпрыгажэнне.*
*Спяваць усім да ста гадоў!*
*Каб праслаўлялі на ўвесь свет*
*Наш Пінкавіцкі сельсавет.*

Лісты падзякі кіраўніку і ўдзельнікам фальклорнага калектыву начальнік аддзела культуры Пінскага райвыканкама Людміла Галавач. На юбілеі прагучала шмат віншаванняў у выглядзе музычных нумароў.

Кожнае слова на юбілейным

адным калектыве людзей, якія любяць спяваць, памятаюць песні, традыцыі і абрады сваіх продкаў і жадаюць перадаць іх наступным пакаленням.

Сэрцам першага склада калектыва сталі носьбіты палескага ... Цімафееўна Лой, дачка якой, Таццяна Фёдараўна Максімчук, падхапіла любоў да народнай песні і ў цяперашні час з'яўляецца загадчыкам Пінкавіцкага Дома культуры і актыўнай удзельніцай калектыву «Крыніцы».

...нога і рэспубліканскага ўзроўняў. Такая колькасць узнагарод кажа пра многае. У 2011 годзе калектыву было прысвоена найменне «народны».

Рэпертуар налічвае больш за 400 рознахарактарных народных ...

...ры Святлана Калодзіч, Мікалай Саўчанчык і Аляксандр Хаустовіч.

Але ўсё ж галоўнае на юбілеі – гэта віншаванні, добрыя пажаданні і сюрпрызы. Цёпла прывітала юбіляраў і ўручыла ...

...свяце было афарбавана асаблівай цеплынёй і шчырасцю. Пажадаем далейшага росквіту калектыву і незгасальнай творчасці!

**Святлана МАЖАРОЎСКАЯ,**
**бібліятэкар Пінкавіцкай СБ**